Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

# За Совецкую Радзиму

23 (42)
Чацвер
11
мая
1944 г.

Орган Уздзенскага РК КП(б)Б

**Смерць нямецким акупантам!**

**Справа цяпер заключаецца у тым, каб ачысциць ад фашысцких захопникау УСЮ нашу зямлю и аднавиць дзяржауныя границы Совецкага Саюза ПА УСЕЙ ЛИНИИ, ад Чорнага мора да Баранцава мора.**

(З загада Вярхоунага Галоунакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша И. Сталина).

## ДАПАМОЖАМ ЧЫРВОНАЙ АРМИИ ДАБИЦЬ ФАШЫСЦКАГА ЗВЕРА

Па усёй Совецкай краине разнеслися ясныя и мудрыя словы першамайскага загада таварыша Сталина аб блискучых перамогах Чырвонай Армии и поспехах усяго совецкага народа у барацьбе супроць нямецка-фашысцких захопникау.

Чырвоная Армия у сваим пераможным наступе прайшла з баями ад Волги да Серэта, ад прадгор'яу Каук аза да Карпат, знишчаючы фашысцкую нечысць и вымятаючы яе з совецкай зямли. Совецкия войски выйшли на нашы дзяржауныя границы на працягу больш 400 клм., вызвалиушы ад захопникау звыш $^3/_4$ акупиравана й совецкай зямли. 10 мая воины Чырвонай Армии, авалодаушы крэпасцю Севастопаль, канчаткова вызвалили ад нямецких гадау Совецки Крым.

Поспехи Чырвонай Армии стали магчымы дзякуючы правильнай стратэгии и тактыцы совецкага камандавання, дзякуючы высокаму маральнаму духу и наступальнаму парыву нашых войск, узброеных навейшай совецкай ваеннай тэхникай.

Поспехам Чырвонай Армии у значнай меры садзейничали нашы вялиния американския и английския саюзники.

Высока ацаниу таварыш Сталин работу совецкага тыла, яки забяспечвау Чырвоную Армию усим неабходным.

Увесь совецки народ прапоунен рашучасци ускорыць разгром ворага и поунасцю аднавиць разбураную ворагам гаспадарку.

Сакрушальныя удары Чырвонай Армии пастэвили гитлераускую Германию и яе разбойницки блок на край пропасци. Страх агарнуу финских, румынских, венгерских и балгарских „саюзникау" Гитлера, яких можа выратаваць тольки адно—разрыу з Германией и выхад з вайны.

Таварыш Сталин у сваим загадзе указвае, што совецкаму народу и Чырвонай Армии неабходна „...ачысциць ад фашысцких захопникау УСЮ нашу зямлю и аднавиць дзяржауныя границы Совецкага Саюза ПА УСЕЙ ЛИНИИ, ад Чорнага мора да Баранцава мора".

Загад таварыша Сталина—загад Радзимы. И ён будзе выканан. Парукай таму—высоки патрыятызм совецких людзей, мудрае кирауництва большэвицкай партыи и вяликата Сталина.

Нашы задачы не могуць абмежавацца тольки ачышчэнием усёй совецкай зямли ад ворага. Фашысцки звер цяжка ранен и адпаузае у сваю бярлогу. Яго патрэбна праследваць па пятах и дабиць у яго уласнай бярлозе—Германии, „шляхам сумесных удару з Усходу—силами нашых войск и з Захаду—силами войск нашых саюзникау" (И. Сталин). И гэта настане у самым хуткім часе.

Першамайски загад правадыра натхняе нас, беларуских партызан, и увесь народ на новыя подвиги. Сваёй нястомнай барацьбой супроць ворага дапаможам Чырвонай Армии дабиць фашысцкага звера.

## НА ФРАНТАХ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

У Крыму нашы войски, пры падтрымцы масираваных ударау авияцыи и магутнага агня артылерыи, **7 мая** пачали штурм вельми умацаваных пазицый нямецка-фашысцких войск, якия абараняли **Севастопаль**. За два дни жорстких баёу нашы войски зламали супрациуленне працiуника и на усим працягу прарвали асноуную паласу Севастопальскага умацаванага раёна з моцна развитай системай жалезабетонных збудаванняу. Нашы войски, прасунуушыся уперад да **6 клм.**, заняли высоты и магутныя вузлы абароны працiуника, якия пануюць над раёнам **Севастопаля**: Любимауку, чыгуначную станцыю Мекензиевы Горы, Маяк, Усходни Инкерманский Маяк, Заходни Инкерман, гору Сахарная Галоука, Гайтани, Инкерман, Сапун-Гара, калгас „Большэвик", соугас № 10, Карань, гару Каябаш и завязали баи на блнжэйшых подступах к гораду Севастопаль.

На працягу **9 мая** у Крыму войски **4-га Украинскага** фронта пры падтрымцы масираваных ударау авияцыи и артылерыи працягвали наступальныя баи супроць нямецка-фашысцких войск у раёне **Севастопаля** и, зламаушы упорнае супрациуленне працiуника, ноччу штурмам авалодали крэпасцю и важнейшай военна-марской базай на **Чорным моры—горадам Севастопаль**.

Тым самым ликвидаван апошни ачаг супрациулення немцау у **Крыму**, и **Крым** поунасцю ачышчан ад нямецка-фашысцких захопникау.

На працягу **10 мая** на франтах истотных змен не адбылося.

## Салют Радзимы

10 Мая, у 1 гадзину, сталица нашай Радзимы Масква ад имени Радзимы салютавала доблесным войскам 4-га Украинскага фронта, авалодаушым горадам Севастопаль,—24 артылерыйскими залпами з 324 гармат,

## Загад правадыра натхняе нас на подвиги

Стройныя, як вылитыя з сталi и бронi, шэрагi партызан Н-скай брыгады застылi ва урачыстай цишынi. Тольки раздаецца гучны голас камандзира брыгады Василя Е. Камандзир чытае першамайски загад Вярхоунага Галоунакамандуючага таварыша Сталина. Мудрыя словы генияльнага правадыра вялiкага Сталина глыбока западаюць у сэрцы партызан, натхняюць их на новыя баявыя подвиги у барацьбе супроць равенага вямецкага звера.

Святы абавязак кожнага партызана и партызанки дапамагчы Чырвонай Армии выгнаць з нашай зямли гитлераускага звера и дабиць яго. Партызаны Н-скай брыгады, натхнёныя першамайским загадам правадыра, заявили, што не пашкадуюць сил и жыцця для справы канчатковага разгрома гитлерауских гадау.

Калюжны.

## Радасна сустрэли загад таварыша СТАЛИНА

Як тольки быу атрыман тэкст загада Вярхоунага Галоунакамандуючага таварыша Сталина ад 1 мая г.г., партызанския агитатары Н-скай брыгады наладзили у вёсках нашага раёна митынги, на яких зачытали першамайски загад правадыра.

З вялiкай радасцю сустрэли працоуныя нашага раёна першамайски загад таварыша Сталина. На многалюдных митынгах, прысвечаных зачытцы загада, працоуныя выразили сваю велахиспую рашучасць аддаць усе силы и усими сродками дапамагчы Чырвонай Армии и народным мсцицуцам дабиць фашысцкага звера. Сяляне и сялянки запэунили партызан у тым, што яны прыкладуць усе силы на хутчэйшае заканчэние вясенняга сева, ураджай якога будзе сабраны не для вашызных фрыцау, а для самих сябе и геранчнай Чырвонай Армии.

Тарас Д.

## Яшчэ больш ярасна буду знишчаць Фрыцаў!

У сваим першамайским загадзе Вярхоуны Галоунакамандуючы Маршал Совецкага Саюза таварыш Сталин загадвае Чырвонай Армии ачысциць ад фашысцких захопникау усю нашу зямлю и аднавиць дзяржауныя границы Совецкага Саюза па усей линии, ад Чорнага мора да Барэнцава мора. Мы, совецкия партызаны, павинны дапамагчы нашай роднай Чырвонай Армии выканаць гэты загад.

Я не мала знишчыу нямецкай поскудзи. На маим баявым рахунку 13 узарваных аутамашын ворага, 3 спушчаныя пад адкос нямецкия эшалоны, 2 узарваныя танкетки и 1 матацыкл, 6000 м. парэзанай сувязи фашыстау. Але гэтыя поспехи мяне не заспакояць.

Буду и надалей яшчэ больш ярасна знишчаць фрыцау, каб хутчэй дабиць гитлераускага звера!

Миша Н., атрад имени Б. Х.

## Чуеш, край мой милы!

Чуеш, край мой милы,
Люд многапакутны—
Радуйся, звежай:
Ломиць наша сила
Чорны стан атрутны
Гитлерауских зграй!
Славу их развеяу
Наш совецки воин,
Волат-багатыр.
Кроую лихадзейну
Сож и Днепр нэпоси
И халодны жвир.
Верасневуским громам
Армия збавення
Збила шчыт-запор,
И над твоим домам,
Край доугацярпення,
Зорацъ вочы зор.
Усмех сонца шырай
Свецицъ над табою,
Говицъ з долу цень.
Выйдзи з сэрцам шчырым,
З яснаю душою,
Воинау сустрэнь!
Прыгарни, як сына,
Абними, як брата,
Кожнага байца.
Родная краина,
Близка твоё свята,
Радасць без канца!

Якуб КОЛАС

## Па Совецкаму Саюзу

З вялiким патрыятычным уздымам працоуныя Совецкага Саюза падписваюцца на выпушчаны 5 мая г.г. 3-ци дзяржауны ваенны заём. Намечаная сума падписки 25 мильярдау руб. ужо была перавышана 6 мая на 213 мильенау руб.

Горача адгукнулися на падписку працоуныя вызваленых раёнау Беларуси. Так, у першы дзень падписки на заем жыхары Мозыра падписалися на 400.000 руб. Сума падписки у Новабелицы к 7 мая дасягнула 1.270.000 руб.

30 красавика у Маскве за прэс-канферэнцыи прадстаунiкоу совецкага и замежнага друку тав. А. Я. Вышынски зрабиу заяву, аб тым, што, у вынику перагавору Совецкага Урада з Чэхаславацким Урадам, памиж Совецким Саюзам и Чэхаславакияй заключана Згода на выпадак уступлення совецких войск у Чэхаславакию. Згода складаецца з 9 артыкулау. Па совецка-чэхаславацкай згодзе галоунакамандуючы совецкими войсками мае права на уладу и адказнасць на чэхаславацкай тэрыторыи тольки у межах зоны ваенных аперацый и тольки у справах, якия адносяцца да вядзення вайны. Чэхаславацки Урад зможа ажыццяуляць вярхоуную уладу над вызвалеными абласцями, як тольки яны перастануць быць арэнай ваенных дзеянняу.

## Миждународная хроника

У 1943 годзе ЗША и Брытанская имперыя выпускали у сярэдним 14,5 камплектных самалётау, 9 гармат, амаль 106 тысяч снарадау и прыкладна 3 мильёны патронау.

Не менш 100 тысяч жыхароу Бельгии удзельничае у падпольнай барацьбе супроць акупантау. На прадпрыемствах, якия працуюць на немцау, шырокия размеры набывае сабатаж и дыверсии. У Бельгии выходзиць каля 20 падпольных газет.

РЭДКАЛЕГИЯ